КУЛЬТУРА

# Выстава да двух юбілеяў

**Тыдзень нямецкай мовы і культуры з поспехам прайшоў у Полацкім дзяржаўным універсітэце пры падтрымцы Пасольства ФРГ у Мінску і Германскай службы акадэмічных абменаў (DAAD). Адной з цэнтральных падзей стала адкрыццё выставы постараў «500 гадоў Рэфармацыі», прысвечанай двум знакавым юбілеям у гісторыі нямецкага і беларускага народаў.**

У нашай краіне сёлета адзначаецца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, заснавальнікам якога быў выдатны асветнік-гуманіст Францыск Скарына. У Германіі таксама паўтысячы гадоў таму знакаміты багаслоў Марцін Лютэр стаў ініцыятарам рэлігійнага і грамадска-палітычнага рэфарматарскага руху, у выніку якога з'явіўся яшчэ адзін напрамак хрысціянства – пратэстантызм. Лютэр, як і Скарына, пераклаў Святое Пісанне на мову свайго народа, каб яно было больш зразумелым простым людзям. Дарэчы, звод тэзісаў Марціна Лютэра быў уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА разам з 13 іншымі дакументамі аўтара.



*На адкрыцці выставы дэкан гуманітарнага факультэта ПДУ Дзяніс Кандакоў, Аня Лютэр, Святлана Вягера.*

Праект пасольства ФРГ «Тыдні Германіі», як распавяла **намеснік Пасла Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Беларусі Аня Лютэр**, пачынаўся больш за дзесяць гадоў назад у Мінску, а потым ахапіў іншыя гарады Беларусі. Полацк сярод іх займае адметнае месца як самы старажытны гісторыка-культурны цэнтр краіны, дзе годна працягваюцца багатыя асветніцкія традыцыі мінулага.

– Полацкі ўніверсітэт, – падкрэсліла намеснік пасла ФРГ, – выдатны партнёр, які актыўна рэалізуе сумесныя адукацыйныя і культурныя мерапрыемствы, мае шмат цікавых ініцыятыў.

**Першы прарэктар ПДУ Святлана Вягера** перадала шчырую падзяку нямецкім партнёрам за плённае супрацоўніцтва, што дае практычныя вынікі. Універсітэт атрымлівае фінансавую падтрымку і мае магчымасць адпраўляць сваіх студэнтаў на замежныя стажыроўкі, запрашаць для чытання лекцый еўрапейскіх навукоўцаў, развіваць мультыкультурнае асяроддзе, рэалізоўваць новыя міжнародныя праекты.

**Ларыса МАЛАШЭНЯ,**
**фота аўтара.**